# СТАСУНКІ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ І ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў СПРАВЕ АХОВЫ ЦАРКОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў 1921–1939 гг.

*Булаты П. Ю.*
*(Мінск, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы)*

У перыяд 1921–1939 гг. урад Другой Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі землі Заходняй Беларусі, праводзіў акрэсленую і мэтанакіраваную палітыку па захаванню культурна-гістарычнай архітэктурнай спадчыны. З мэтай аховы помнікаў у дзяржаве ствараліся спецыяльныя інстытуцыі, вызначаліся іх функцыі, зоны ўплыву і адказнасці. Падпарадкоўваліся яны Міністэрству веравызнанняў і народнай асветы, на якім ляжала галоўная адказнасць за зберажэнне спадчыны. У рэчышчы палітыкі па ахове спадчыны ажыццяўлялася інвентарызацыя помнікаў. Для зручнасці краіна падзялялася на акругі па кансервацыі, якія падпарадкоўваліся Варшаўскай Радзе кансерватараў. Канчаткова акругі па кансервацыі былі сфармаваныя ў 1923 г., землі Заходняй Беларусі ўваходзілі ў

Варшаўскую акругу (Беластоцкае і Палескае ваяводства) і Віленскую акругу (Віленскае і Наваградскае ваяводствы) [5].

Згодна з пастанаўленнем міністэрства веравызнанняў і народнай асветы ад 17 мая 1924 г. для дапамогі цэнтральнаму органу ў рэалізацыі палітыкі па захаванню помнікаў у сталіцах акруг ствараліся рэгіянальныя камісіі па кансервацыі. У іх склад уваходзіў галоўны кансерватар акругі, ваявода, па два прадстаўнікі ад мясцовых акадэмічных колаў і грамадскіх навуковых і культурных аб'яднанняў, чатыры прадстаўніка духавенства, а таксама ў склад камісіі маглі ўваходзіць члены-карэспандэнты. Камісія мусіла даваць заключэнні аб будаўнічых планах, вырашаць пытанні інвентарызацыі, рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў рознага кшталту, якія знаходзіліся ў межах яе акругі [5].

Уся дзейнасць рэгіянальнай камісіі суправаджалася падрабязным справаводствам адносна кожнага помніка спадчыны. Значная частка дакументаў Віленскай акругі па кансервацыі, у якіх прадстаўленыя матэрыялы па ахове, рэстаўрацыі і кансервацыі архітэктурных, археалагічных помнікаў і помнікаў прыроды на землях Віленскага і Наваградскага ваяводстваў, захоўваецца ў Архіве навуковага цэнтра культурнай спадчыны Літвы (Lietuvos Kultūros Paveldo Mosklinio Centro Archyvas). Найбольшая колькасць важных дакументаў прадстаўлена ў фондзе №22 «Дакументы арганізацый, устаноў і асоб па ахове, кансервацыі і рэстаўрацыі прыроднай, культурнай і архітэктурнай спадчыны 1911–1939 (Susisiekimo-statybos skyriaus meno poskyrio susirašinėjimas su organizacijomis, įstaigomis ir asmenimis dėl gamtos, kultūros ir architektūros paminklų išsaugojimo bei restauravimo 1911–1939)». Фонд налічвае 266 спраў, з іх 179 спраў непасрэдна звязаныя з аб'ектамі і працэсамі, якія мелі месца на землях Заходняй Беларусі [5]. Пераважная большасць спраў датычыцца помнікаў фартыфікацыі, архітэктурных комплексаў буйных гарадоў, каталіцкіх духоўных цэнтраў (кляштараў, асобных храмаў), шляхецкіх сядзіб і паркаў. Літаральна адзінкава прадстаўлены справы, якія закранаюць помнікі

спадчыны Праваслаўнай Царквы. На адну з іх – справу праваслаўнай царквы ў г. Ляхавічы – звернем увагу і на яе прыкладзе разгледзім: як выбудоўваліся адносіны польскай дзяржавы з Праваслаўнай Царквой у галіне аховы помнікаў. Дадзеныя адносіны асабліва цікава прасачыць у рэчышчы агульнай палітыкі дзяржавы да Праваслаўнай Царквы, якая знаходзілася пад строгім кантролем Міністэрства веравызнання і народнай асветы.

Перш за ўсё, дзеля разумення шэрагу акалічнасцей у справе аховы ляхавіцкай праваслаўнай царквы Узвіжання Святога Крыжа, звернем увагу на гісторыю будынка. Будынак храма быў пабудаваны ў 1770-я гг. і першапачаткова з’яўляўся каталіцкім храмам. Узвядзенне ў горадзе новага касцёла было выклікана разбурэннямі часоў Барскай канфедэрацыі [11, с. 408, 411]. Фундаваў будаўніцтва ўладар Ляхавіцкага графства Віленскі біскуп І. Масальскі. Касцёл будаваўся з каменю, дах пакрывала глазураваная дахоўка, фасад быў фарбаваны і аздоблены вазонамі [6]. Будынак уяўляў сабою трохнефавы бязвежавы храм ў формах позняга барока з уласцівымі для стылю рысамі – узбуйненай пластыкай аб’ёмаў галоўнага і больш нізкіх бакавых нефаў, манументальнай паўкруглай апсідай. У рытмічнай арганізацыі фасадаў захоўваліся лучковыя і спараныя арачныя праёмы ў пластычных ліштвах [4, с. 433].

У 1867 г. ляхавіцкія прыхаджане касцёла разам з пробашчам іераманахам бенедыктынскага ордэна Анзельмам Гірдвойнам далучыліся да Праваслаўнай Царквы. У той жа час адбылося пераасвячэнне будынка касцёла ў праваслаўную царкву Узвіжання Святога Крыжа. Разам з пераасвячэннем адбыліся і пэўныя змены архітэктурнага вобліку: храм набыў рысы і элементы распаўсюджанага тады наварускага стылю (2-ярусная вежа-званіца з шатровым пакрыццём і макаўкай у завяршэнні над галоўным фасадам, а таксама 12-гранны барабан, завершаны цыбулепадобнай галоўкай, над алтарнай часткай [4, с. 433]).

Царква ў Ляхавічах сур'ёзна пацярпела падчас пажару, які адбыўся ў жніўні 1874 г. Да пажару сцены храма былі фарбаваныя ў жоўты колер; меўся гонтавы дах мазаны алейнай фарбай. У вогнішчы загінуў разны алтар, а сам храм па пажары, доўгі час стаяў без даха, што вяло да разбурэння будынка [7]. Цалкам адноўлены будынак царквы быў прыкладна да 1890-я і ўжо ў 1908 г. у ляхавіцкім прыходзе адбылася вялікая ўрачыстасць: сюды была прывезеная ікона Маці Божай Афонскай [8]. Адзначым, што ў час Першай Сусветнай вайны, нягледзячы на тое, што лінія фронту праходзіла ў некалькіх кіламетрах ад Ляхавічаў, царква захавалася, але не выключаюцца пашкоджанні будынка. Не выключаюцца і разбурэнні царквы падчас наступных канфліктаў (баявыя дзеянні Савецка-Польскай вайны, дзеянні камуністычнага партызанскага руху пач. 1920-х гг.).

Пасля Рыжскай мірнай дамовы і ўваходжання ў склад Польшчы, ляхавіцкая царква заставалася праваслаўнаю, хоць у 1920-я гг. дзяржавай і ажыццяўлялася палітыка па вяртанні былых каталіцкіх храмаў іх першапачатковым уладарам. Прычына, па якой у Ляхавічах не было праведзена рэвіндыкацыі, палягае, на нашу думку, у тым, што ў горадзе з 1907 г. ужо мелася каталіцкая парафія Св. Язэпа [12] і не было пільнай патрэбы ў яшчэ адным каталіцкім прыходзе.

У 1920-я ў ляхавіцкім праваслаўным прыходзе паўстала патрэба сур'ёзнага рамонту храмавага будынку. У сувязі з гэтым і распачаліся фармальныя адносіны двух інстытуцый – Праваслаўнай Царквы і Віленскай акругі па кансервацыі ў справе аховы і аднаўлення помніка архітэктуры. Справа ляхавіцкай царквы ўключае 9 аркушаў [9], якія ўяўляюць з сябе лісты і пастановы, накіраваныя як з Вільні ў Ляхавічы, так і з Ляхавічаў у Вільню і іншыя структуры.

Пачаткам справы з'яўляецца ліст-запрос ад 7 ліпеня 1927 г. накіраваны з ляхавіцкага прыхода ва ўрад Наваградскага ваяводства з просьбаю дазволіць рамонт будынку. Сам ліст у архіўнай справе не прадстаўлены. Аб ім мы даведаліся з адказу на яго, што быў

накіраваны ў Ляхавічы, дзе маецца адсылка на адзначаны вышэй запрос [9, арк. 1]. У сваім адказе ад 23 жніўня 1927 г. на імя царкоўнага старасты Антонія Чарняўскага ўрад дае дазвол на рамонт царквы. У лісце прыводзіцца пералік неабходных прац:

1) замена пакрыцця даху з бляхі на ацынкаваную бляху;

2) аднаўленне знешняй і ўнутранай тынкоўкі, яе бяленне;

3) падшыўка столі дошкамі;

4) шкленне і рамонт аконных рам і папраўка падлогі.

У лісце акрэсліваюцца важныя ўмовы: будынак царквы з’яўляецца помнікам, у сувязі з чым без асобнага дазволу ўлады нельга выконваць якіх-небудзь будаўнічых прац, якія маглі б паўплываць на змену знешняга выгляду будынка царквы. Ліст падпісаны ваяводам і членам Віленскай камісіі па кансервацыі інжынерам Фрызендардам [9, арк. 1].

Пасля адзначанага ліста стасункі паміж прыходам і Камісіяй замарудзілася да 1930 г. Што адбывалася ў перыяд з 1927 па 1930 гг. – дакладна не вядома. Можна меркаваць, што ў гэты час Камісіяй вяліся справы па ўдакладненні статусу помніка, дапускаем доўгачасовыя мерапрыемствы па непасрэдным аглядзе і археаграфічным даследаванні будынка царквы, дакладнаму вызначэнню неабходных прац. Грунтуюцца думкі на змесце тэлеграмы, якая была накіраваная павятоваму старасту (Ляхавічы ўваходзілі ў склада Баранавіцкага павету) 28 чэрвеня 1930 г. галоўным кансерватарам Віленскай акругі доктарам Станіславам Лорэнцам. У паведамленні Лорэнц адзначаў, што царква ў Ляхавічах прызнаная помнікам з адпаведным статусам па яго ахове. Да тэлеграмы дапасоўваўся пакет дакументаў (у справе не прадстаўленыя) [9, арк. 7]. Фактычна, з гэтага часу пачалася актыўная фаза стасункаў Царквы і камісіі па кансервацыі.

Ужо 30 ліпеня 1930 г. павятовым старастам Д. Верберам быў накіраваны настаяцелю ляхавіцкай царквы а. Сяргею Раждзественскаму афіцыйны ліст [9, арк. 2]. У ім адзначаецца, што

«царква (былы касцёл) у Ляхавічах знаходзіцца ў стане значнага занядбання». І далей падкрэсліваецца: царква з'яўляецца помнікам вялікай вартасці і каштоўнасці. Згодна з распараджэннем Прэзідэнта Рэчы Паспалітай аб апецы над помнікамі іх уласнікамі і ўтрыманні ў належным стане, настаяцелю прадпісваецца пачаць рамонт царквы і давесці яе да належнага стану. Таксама вызначалася прадставіць на зацвярджэнне галоўнаму кансерватару праз пасрэдніцтва павятовага старасты праект рамонту царквы. Тэрмін на састаўленне і прадстаўленне праекту адводзіўся да 15 жніўня 1930 г. [9, арк. 2].

Адразу па атрыманні ліста ў Ляхавічах быў створаны камітэт па рамонту царквы. У яго склад увайшлі: настаяцель царквы а. С. Раждзественскі (старшыня), царкоўны стараста А. Чарняўскі (сакратар), чальцамі былі Іван Невядзінскі, Асіп Навіцкі, Лушкевіч. Парушыўшы тэрмін, 25 жніўня 1930 г. камітэтам па рамонце ў Вільню кансерватару культуры і мастацтва быў дасланы ліст з просьбаю аб зацвярджэнні рамонтнага праекту (на жаль, самаго праекту ў справе няма) [9, арк. 3]. Складзены праект быў ваяводскім інжынерам на падставе прац, вызначаных лістом ад 23 жніўня 1927 г. [9, арк. 3].

Атрымаўшы складзены ў Ляхавічах праект рамонту, Віленская камісія 29 верасня 1930 г. яго зацвердзіла, але і ўнесла ў праект некаторыя карэктывы. Так, адзначалася, што дах у царкве мусіць быць не з ацынкаванай бляхі, а з пафарбаванай бляхі [9, арк. 4, арк. 5]. Рашэнне камісіі з вызначанымі праектнымі праўкамі былі дасланыя ў ваяводскі ўрад [9, арк. 4], павятоваму старасце [9, арк. 5] і ў камітэт па рамонту царквы непасрэдна ў Ляхавічы [9, арк. 5].

Ад гэтага часу фармальна рамонт царквы ў Ляхавічах быў дазволены і можна было распачынаць працы. Аднак заставалася яшчэ адна істотная праблема – фінансаванне рамонтных прац. У сувязі з тым, што будынак царквы быў прызнаны гістарычным помнікам, прыход меў права атрымаць на будоўлю субсідыю альбо аднаўленчыя працы маглі быць падтрыманыя шляхам крэдытавання.

Але 13 сакавіка 1931 г. з Віленскай камісіі ў Ляхавічы быў дасланы ліст, у якім адзначаецца, што ў бягучым годзе не прадугледжваецца выдачы сродкаў на рамонтныя працы. Камітэту прадпісвалася шукаць сродкі праз ваяводскі ўрад [9, арк. 6]. Так, справа рамонту зноў была прыпыненая.

Зноў у актыўную стадыю працэс увайшоў толькі ў 1936 г. Адзначым, што за гэты час у ляхавіцкай царкве змяніўся настаяцель. Так, 15 мая 1932 г. а. Сяргей Раждзественскі быў зняты з пасады настаяцеля ляхавіцкага прыходу і накіраваны ў прыход в. Адахаўшчына. На яго месца быў прызначаны а. Антоній Сокал-Кутылоўскі [1]. У перыяд з 1931 па 1936 г., праўдападобна, прыход рабіў захады па атрыманню сродкаў на рамонтныя працы, якія не закраналі кампетэнцыі Віленскай камісіі па кансервацыі (таму дакументы за гэты час адсутнічаюць у архіўнай справе). Задзейнічаны ў справе былі як свецкія, так і царкоўныя структуры. Вынікае гэта з афіцыйнай тэлеграмы кіраўніка аддзелу будаўніцтва інжынера К. Тымінскага да наваградскага кансерватара на прадмет крэдытавання рамонту царквы ў Ляхавічах, якая датуецца 22 лютым 1936 г. [9, арк. 8]. У паведамленні адзначана, што на падставе звароту Гродзенскага і Наваградскага епіскапа Антонія ад 10 снежня 1935 г., запрашваецца выдаткаваць сродкі на рамонт царквы [9, арк. 8]. На нашу думку, вывесці справу з рэжыму чакання дапамог згаданы зварот епіскапа Антонія ў Камісію. Адзначым, што ўладыка ўлетку 1935 г. быў з візітам у Ляхавічах, здзяйсняючы паездку па прыходах Баранавіцкага і Нясвіжскага паветаў [2, с. 155].

Кропка ў справе была пастаўленая лістом ад 6 сакавіка 1936 г. [9, арк. 9]. У ім адзначалася, што на падставе тэлеграмы, а таксама зваротаў ад 24 мая 1934 г. і 15 лютага 1936 г., ваяводскім урадам прынята рашэнне выдаткаваць 1500 злотых на рамонт праваслаўнай царквы ў Ляхавічах [9, арк. 9]. Больш звестак адносна рамонту ляхавіцкай царквы ў архіўнай справе не прадстаўлена.

Трэба меркаваць, што зацвердзіўшы праект і атрымаўшы фінансава нне, рамонт у ляхавіцкай праваслаўнай царкве Узвіжання Святога Крыжа быў здзейснены. Дакументальных альбо публіцыстычных пацвярджэнняў не было выяўлена, але маюцца ўскосныя звесткі. 15 студзеня 1938 г. настаяцель ляхавіцкай царквы, якім на той час ужо з'яўляўся прат. Цімафей Дзюкаў, быў назначаны на пасаду благачыннага Баранавіцкай акругі [3, с. 110]. Адпаведна, ляхавіцкі прыход займаў цэнтральнае месца ў адміністрацыйнай структуры адзначанага ўзроўню. Наўрад ці значнае месца ў царкоўнай структуры мог займаць прыход з не рэпрэзентабельным будынкам храма, які, згодна з вызначэннем Камісіі, з'яўляўся ляхавіцкі да рамонту. Свой статус цэнтральнага храма ў благачынні прыход у Ляхавічах захоўваў і ў 1939 г. [10, с. 32].

Абагульняючы адносна ўсяго працэсу правядзення рамонту ў ляхавіцкай царкве адзначым, што агулам ён цягнуўся з 1927 па 1936 г. У ім яскрава вылучаюцца тры актыўныя і два пасіўныя перыяды:

*Першы актыўны*, 1927 г. – фармальны пачатак працэсу, вызначэнне неабходных прац;

*Другі пасіўны*, 1927–1930 гг. – праца Камісіі па ўстанаўленні статусу помніка ляхавіцкай царкве, магчыма, правядзенне яго агляду і даследаванняў;

*Трэці актыўны*, 1930–1931 гг. – вызначэнне статусу, фармаванне рамонтнага камітэту, складанне, зацвярджэнне і праўкі праекту па рамону царквы;

*Чацвёрты пасіўны*, 1931–1936 гг. – крызіс фінансавання, пошукі сродкаў на рамонтныя працы;

*Пяты актыўны*, 1936 г. – атрыманне сродкаў; верагодны пачатак рамонтных прац.

Такім чынам, разгледзеўшы працэс ажыццяўлення рамонту праваслаўнай царквы ў Ляхавічах (на падставе матэрыялаў з архіўных фондаў Віленскай камісіі па кансервацыі), можам адзначыць наступнае:

1) Працэс рамонту з’яўляўся доўгай і бюракратычна складанай працэдурай, якая суправаджалася шэрагам дакументаў. Самымі зацяжнымі момантамі рамонтных прац з’яўляліся працэсы вызначэння статусу помніка і пошуку сродкаў. Аднак пытанні, звязаныя з прыняццем рашэнняў і зацвярджэнне праектаў вырашаліся адносна хутка і аператыўна;

2) У працэсе рамонту былі задзейнічаны розныя інстытуцыі. Першапачаткова прыход ляхавіцкай царквы прадстаўляў настаяцель, але з пачаткам актыўнай фазы падрыхтоўкі праекту па рамонце царквы ўсімі справамі займаўся адмыслова створаны камітэт, куды ўвайшоў сам настаяцель, царкоўны стараста і іншыя асобы. Камітэт па справах рамонту ажыццяўляў камунікацыі з павятовым урадам, урадам ваяводскім, Віленскай камісіяй па кансервацыі помнікаў. Удзельнічалі ў справе і царкоўныя структуры.

3) На прыкладзе ажыццяўлення рамонту храма ў Ляхавічах бачна, што польская дзяржава была зацікаўлена ў захаванні помнікаў спадчыны, якія належалі Праваслаўнай Царкве. Будынкам надавалася ўвага, выдаткоўваліся сродкі. Гэты факт асабліва важны ў рэчышчы агульнай палітыкі і складаных стасункаў, якія мелі месца паміж дзяржавай і Царквой. На іх фоне стасункі ў справе супольнай аховы спадчыны з’яўляюцца пазітыўным момантам у інстытуцыянальных ўзаемаадносінах. Але варта мець на ўвазе адну акалічнасць. Хоць ляхавіцкі храм не быў рэвіндыкаваны, але мінулая прыналежнасць да Каталіцкай Царквы ў афіцыйных дакументах адзначаецца.

4) У справе рамонту яскрава прасочваецца пільнасць і далікатнасць, з якой Віленская камісія ставілася да помнікаў архітэктурнай спадчыны. Увага да дэталяў, педантычнасць у падрыхтоўчай працы, клопат аб захаванні аўтэнтычнасці – усё гэта мела месцы ў працы Камісіі пры ажыццяўленні рамонту праваслаўнай царквы ў Ляхавічах.

**Крыніцы і літаратура**


1. Воскресное чтение. – 1932. – № 26.

2. Воскресное чтение. – 1935. – № 12.

3. Воскресное чтение. – 1938. – № 10.

4. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі / А. М. Кулагін – Мінск, 2008. – 488 с.

5. Морозов, Д. В. Материалы по охране памятников в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) в фондах Архива научного центра культурного наследия Литвы / Д. В. Морозов // Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры : зборнік матэрыялаў, Мінск, 5–6 мая 2016 г. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 748–750.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 223.

7. Описание церквей и приходов Минской епархии 1878/79 гг. – Минск, 1879.

8. Сущинский, П. Торжество перенесения иконы Афонской Божией Матери “Предвозвестительница” в Ляховичскую церковь, 20–21 сентября 1908 г. / П. Сущинский – Минск : Типография С.А.Некрасова, 1909. – 11 с.

9. Lietuvos Kultūros Paveldo Mosklinio Centro Archyvas. – F. 22. V. 1. Nr. 104.

10. Spis Abonentów Sieci Telefonicznej Okręgu Dyrekcji Poczt i Telegrafów w Wilnie. – Wilno, 1939.

11. Volumina Legum : w 10 t. – SPb. – 1859–1860. – T. 8. – 1860. – 590 s.

12. Żyskar, J. Nasze kościoly: opis ilustrowany wszystkich kościołów i parafji znajdujących się na obszarach dawnej Polski i ziemiach przyległych : w 2 t. / J. Żyskar D. Bączkowski. – Warszawa, 1913. – T. 2 : w 2 cz. – Cz. 2 : Djecezja Mińska. – 346 s.

## ДАДАТАК 1
## Фотаздымак будынка Ляхавіцкай царквы

*Аўтар:* J. Langda;

*Час і месца стварэння:* Ляхавічы, датуецца пач. ХХ ст.;

*Месца захоўвання (публікацыі):* копія здымка захоўваецца ў аддзеле фотаздымкаў і малюнкаў Інстытуту мастацтва Польскай акадэміі навук (нумар негатыву 196136; памер 6х7,2); фрагмент здымка апублікаваны Юзафатам Фрыдэрыкам Жыскарам (Nasze kościoły. Djecezja Mińska. – Warszawa. 1913. – S. 11–14).

Фотакопія аўтара © Цалкам у падобным выглядзе і пашырэнні здымак публікуецца ўпершыню.

